ўвагу наяўнасць у спісе шэрагу мясцовых гатункаў, некаторыя з якіх лічыліся найбольш прыдатнымі для губерні (асабліва гэта датычыцца вішань).

Акрамя таго, П. В. Катовіч лічыў мэтазгодным побач з чыгуначнымі станцыямі і гарадамі вырошчваць белую, чырвоную і асабліва чорную парэчку, але, у першую чаргу, суніцы (клубніцы), асабліва гатунку Нобль Лакстана, Шарпліс, У(г)орка пладародная і Вікторыя [3].

Паколькі, на меркаванне П. В. Катовіча, у Гарадзенскай губерні не было "*добрасумленных пітомнікаў*", то ён рэкамендаваў цэлы шэраг вытворцаў якасных саджанцаў з іншых губерній: 1. Зяленскі (Валынская губ.); 2. Гонгардт (Курская губ.); 3. Балабанаў (Курская губ.); 4. Паўленка (Кіеўская губ.); 5. граф Сіверс (Пскоўская губ.); 6. Спірыдонаў (Пскоўская губ.); 7. граф Замойскі (Седлецкая губ. – з пазначэннем аб выпісванні толькі паўкамлёвых дрэўцаў); 8. Мейер (г. Кіеў) [3].

Складзеныя П. В. Катовічам у 1911 г. рэкамендацыі былі адрасаваныя не толькі тым, хто меў неабходныя сродкі і дастаткова зямлі для вядзення садаводства ў прамысловых памерах, але і звычайным аматарам. Відавочна, што гэта быў даволі кампетэнтны адказ на запыт мясцовага грамадства, якое, на жаль, не атрымала па волі лёсу часу для працы ў накірунку, накрэсленым гарадзенскім аграномам.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Государственный реестр сортов сельскохозяйственных растений. – Минск, 2022.
2. www.sorttest.by.
3. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. Спр. 58.

УДК 357. 23 (091) "1914" (476.6)

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА ТАВАРЫСТВА "РУСКАЕ ЗЕРНЕ" Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1914 Г.: АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ АЎРАЛ НАПЯРЭДАДНІ КАТАСТРОФЫ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На пачатку XX стагоддзя ў межах даволі шырокага спектра ініцыятыў па садзейнічанні сельскагаспадарчай мадэрнізацыі ў Расійскай імерыі сваю нішу спрабавалі заняць разнастайныя арганізацыі, створаныя пад выкананне задач Галоўнай Управы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Землеўпарадкавання і Землекарыстання. Да ліку такіх адносілася "Таварыства садзейнічання пад'ёму земляробства, сельскай гаспадаркі і народнай працаздольнасці ў Санкт-Пецярбурзе "Рускае зерне", якое было заснавана ў 1908 г. Сярод практычных мерапрыемстваў, якімі займалася таварыства, галоўным з'яўлялася арганізацыя азнаямленчай практыкі для сялянскай моладзі, а таксама настаўнікаў і настаўніц народных школ спачатку на замежных сельскагаспадарчых прадпрыемствах ў Маравіі і Даніі, а з 1913 г. таксама і ў "Прыбалтыйскім Краі". Перавага аддавалася былым вайскоўцам, асобам з моцным здароўем і падрыхтаваным да фізічнай працы, але самае істотнае, маючым, прынамсі, частку грошай на дарогу. Працягласць навучання складала восем месяцаў [1, арк. 175].

За першыя пяць гадоў працы таварыства здолела азнаёміць каля 300 асоб з замежным досведам гаспадарання. На 1914 г. дзейнасць таварыства, відавочна, мела станоўчыя вынікі, іначай яно б не займалася актыўным пашырэннем геаграфіі сваёй праграмы, у тым ліку і на Гарадзенскую губерню. Не выключана, што інфармацыя пра "Рускае зерне" даходзіла ў губерню і раней (тым больш, што найбольш актыўныя яго філіялы дзейнічалі ў суседніх Віленскай і Сувалкскай губернях), але, напэўна, першая і, несумненна, апошняя рэальная арганізаваная і падтрыманая мясцовымі ўладамі акцыя таварыства адбылася там літаральна напярэдадні Першай сусветнай вайны. Так ці іначай, менавіта ў красавіку 1914 г. ад імя гарадзенскага віцэ-губернатара Сталярова да ўсіх неад'емных сябраў і аграномаў павятовых землеўладкавальных камісій быў разасланы цыркуляр з інфармацыяй пра магчымасць стажыроўкі і некаторыя новыя праекты таварыства. З 1914 г. таварыства дадаткова прапаноўвала для асобных гаспадароў (ва ўзросце ад 30 да 40 і нават 45 гадоў) экскурсійныя паездкі працягласцю ад трох тыдняў да месяца ў перыяд ад сяўбы ярыны да сенакосу. Кожная партыя экскурсантаў мела налічваць да 25 асоб. Пры гэтым было асабліва падкрэслена, што галоўнай "*маральнай*" мэтай таварыства было не прымусовае капіраванне лепшых узораў гаспадарання "гадаванцамі", а імкненне "*духоўным абавязкам распаўсюджваць атрыманыя імі веды*" для арганізацыі ўзорных гаспадарак на сваёй зямлі па формуле "*не загадам, а прыкладам*" [1]. У праграму мерапрыемстваў таварыства ўваходзіла арганізацыя "*чытанняў з кінематаграфічнымі карцінамі, на якіх будзе адлюстравана ўся хада сельскагаспадарчых работ ў Маравіі і Прыбалтыйскім Краі, віды хутароў, уладкаваных гадаванцамі Таварыства і інш.*", а таксама накіраванне ахвочых дзяўчын (не



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

абавязкова сялянскіх) на вывучэнне практыкі птушкагадоўлі і хатняга гаспадарання ў Расіі і Маравіі [1].

Таварыства мела даволі надзейную крыніцу фінансавання – бюджэтныя сродкі, якія штогод пералічвала ГУЗіЗ. Акрамя таго, невялікую суму давала Міністэрства Народнай адукацыі. Сумарна штогадовая субсідыя для таварыства дасягала 40 000 рублёў. Менавіта фінансавая залежнасць таварыства ад дзяржавы была галоўнай прычынай яго падтрымкі з боку губернскіх улад, якія часам механічна, у выглядзе неабдуманых загадаў, рэалізоўвалі зверху пададзеныя ініцыятывы. Прыкладам апошняга быў цыркуляр віцэ-губернатар ад 14 красавіка 1914 г., у якім патрабававалася "*неадкладна паведаміць*" пра падыходзячых кандыдатаў для ўдзелу ў адукацыйнай праграме "Рускага зерня" [1].

Адказы з месцаў былі розныя. Так, 2 мая 1914 г. аграном паўднёвага раёна Слонімскай землеўладкавальнай камісіі Падкуй-Муха паведаміў, што жадаючых ехаць на практыку няма [1]. Пазней, 10 траўня, адзін з сябраў мясцовай камісіі пацвердзіў гэтую інфармацыю, але дадаў, што 8 траўня аграном Фон-Крузенштэрн знайшоў падыходзячага кандыдата для "паездкі", якім выявіўся хутаранін Іван Жукоўскі [1].

Нягледзячы на суворы загад, рэакцыя з месцаў была не заўсёды аператыўная. Так, з Ваўкавыскай землеўладкавальнай камісіі мясцовы сябра адрэагаваў толькі 18 траўня, а да губернатара і ў Гарадзенскую землеўладкавальную камісію (ГЗК) адказ прыйшоў толькі 23 траўня і быў несуцяшальны, паколькі жадаючых "*вучыцца на практыцы сельскай гаспадарцы ў Ваўкавыскім павеце не было*" [1]. 29 мая на імя губернскага агранома прыйшоў ліст (датаваны 22.05. 1914 г.) ад сябра агранамічнай нарады і сакратара Верцялішскага сельскагаспадарчага таварыства Іпаліта Адамавіча Гамаліцкага, які інфармаваў, што "ў Чэхію" пагадзіўся паехаць селянін жыдамлянскай воласці Гарадзенскага павета Сцяпан Антонавіч Апалайка, які меў 16 гадоў і ў 1913 г. скончыў Верцялішскую двухкласную прыходскую вучэльню [1]. Праз некалькі дзён, 31 мая ў ГЗК прыйшла інфармацыя з Сакольскага павета, якая дазваляе высветліць некаторыя нюансы адбору кандыдатаў. Справа ў тым, што мясцовая камісія пад ўплывам паліцыі (земскага начальніка 1-га участка) падала кандыдатуру селяніна з урочышча Бярозавы Масток Чарнавескай воласці Антона Францавіча Бойкі, а "*незалежна ад гэтага*" сябры камісіі абралі свайго кандытата – хутараніна з вёскі Вылудкі Трафімаўскай воласці Віктара Вікенцьевіча Свенца [1].

З першага Кобрынскага арганамічнага участка 8 траўня 1914 г. інфармавалі пра наяўнасць двух кандыдатаў з сялян: Зіновія Ячніка і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Міхаіла Сідарука [1]. З Бельска 3 траўня быў дасланы цэлы спіс хутаран, якія не толькі выявілі жаданне ехаць, але і “*згодных узяць на дарогу ўласных грошай*”: Іван Крот, Казімір Курэк, Уладзімір Мацкавяк, Кузьма Хількевіч [1].

Па меры таго, як збіраліся звесткі, высветлілася, што губернскае начальства пачало ўсю кампанію без належнага інфармавання і, самае істотнае, практычных гарантый з боку таварыства. Сведчаннем гэтага з’яўляецца запыт агранома Сулкоўскага ад 4 траўня 1914 г., які павдамляў у ГЗК, што на яго “*3-м Іванаўскім агранамічным участку па ўсёй верагоднасці знайдуцца 2-3 селяніна, жадаючых паехаць за мяжу*”, але адначасова ён прасіў даць для гэтых сялян больш падрабязную “*інструкцыю адносна часу выезду, зборнага пункта і указаць прыблізную суму ўласных грошай, якія неабходныя для кожнага экскурсанта, і ці маецца магчымасць адправіць сялян, якія не мелі ніякіх уласных грошай, а таксама, ці патрэбныя замежныя пашпарты*” [1].

У выніку праведзенай “неадкладнай” работы па збору кандыдатаў ужо 12 чэрвеня (!) ад імя выконваючага абавязкі губернатара – віцэ-губернатар – накіраваў да “Рускага зерня” спіс асоб, якія выявілі жаданне і падыходзілі пад крытэрыі, прапанаваныя таварыствам. Частка кандыдатаў былі “*агранамічнымі старостамі, служачымі ў мясцовай агранамічнай арганізацыі*”: 1. Зіновій Ячнік; 2. Іван Жукоўскі; 3. Пётр Пагажэльскі; астатнія паходзілі з ліку сялян: 4. Кузьма Хількевіч (в. Храболы, Райскай вол. Бельскага пав.), 5. Сцяпан Апалайка (в. Завадзіч, Жыдамлянскай вол. Гарадзенскага пав.), 6. Казімір Курэ (в. Сыткі, Семяцічскай вол., Бельскага пав.), 7. Антон Бойка (ур. Бярозавы Масток, Чарнавескай вол, Сакольскага пав.). На перакананне віцэ-губернатара кандыдаты адпавядалі мэтам “Рускага зерня”. Асобна была выказана просьба адносна селяніна З. Янчыка, які “*ў чаканні паездкі прыпыніў будаўніцтва ў сябе хаты*”, у выніку чаго віцэ-губернатар прасіў найхутчэй праінфармаваць пра тое, каго таварыства адабрала і калі адбудзецца паездка [1]. Досыць аператыўна, бо ўжо 17 чэрвеня 1914 г. з таварыства быў накіраваны адказ, які трапіў у губернскую канцылярыю 20 чэрвеня і быў зарэгістраваны пячаткай “Гарадзенскай асаблівай агранамічнай нарады” 24 чэрвеня 1914 г. “Сялянская Камісія Таварыства “Рускае Зерне” паведаміла гарадзенскаму губернатару, што адпраўка сялян за мяжу адбываецца ў “*лютым і сакавіку, каб даць ім магчымасць прайсці поўны цыкл палявых работ*”. Адпаведна з гэтым прапанаваныя ад Гарадзенскай губерні сяляне “*могуць быць пасланымі за мяжу толькі ў 1915 г.*” [1]. Між тым, у самой рассылцы па губерні ўвогуле нічога пра тэрміны не згадвалася і складвалася ўражанне, што сама “экскурсія” мела прайсці ў самы бліжэйшы час. Аўрал выявіўся



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

цалкам неабгрунтаваным, але рэха яго працягвала сваю справу: са спазненнем на імя губернатара і ў ГЗК у другой палове чэрвеня яшчэ даходзілі заяўкі. Так, 18 чэрвеня з Бельскай павятовай землеўладкавальнай камісіі было накіравана паведамленне пра жаданне настаўніка народнай вучэльні Зміцера Міхайлавіча Дзмітрука (меў 26 гадоў) з'ездзіць на "экскурсію", але вось на працяглы васьмімесячны курс ніхто ехаць не пагадзіўся [1]. Канчатковую інфармацыю пра тэрміны стажыроўкі губернскі аграном разаслаў сваім падначаленым 1 ліпеня 1914 г. [1].

Такім чынам, акцыя гарадзенскіх уладаў па адборы кандыдатаў для ўдзелу ў адукацыйнай праграме для сялян, арганізаваная таварыствам "Рускае зерне" у 1914 г., выявілася фактычна марнаваннем часу. Сімптаматычна, што гарадзенскія сяляне не выказалі масавага жадання засвойваць замежны досвед, які ў святле набліжэння вайны было складана выкарыстаць.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 2. спр. 7.

УДК 272(476.4)

## ПРЕДЛОЖЕНИЯ ПО ОРГАНИЗАЦИИ ЗЕМЛЕВЛАДЕНИЯ В ЗАПАДНОМ КРАЕ (1865 Г.)

**Ганчар А. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Относительно высочайшего указа от 10 декабря 1865 г. отметим, что сам журнал высочайше утвержденной особой Комиссии для рассмотрения в. д. министра государственных имуществ генерал-адъютанта Зеленого «О мерах к водворению русского элемента в Западном крае» был представлен князем П. Гагариным 9 декабря 1865 г. Обер-прокурор Св. Синода не принимал участия в суждениях по этому вопросу по причине болезни (сами заседания проходили 29 ноября и 7 декабря 1865 г.). Журнал не был подписан и статс-секретарем Милютиным за отъездом его из г. Санкт-Петербурга. Собственно, в состав Комиссии также входили статс-секретарь граф Панин, генерал-адъютант князь Долгоруков, генерал-адъютант Зеленый, генерал-адъютант Милютин, генерал-адъютант фон-Кауфман, статс-секретарь Валуев, Рейтерн, гофмейстер граф Толстой



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ